

# «МЫ ПОЎНЫЯ РАШУЧАСЦІ АДСТАЯЦЬ СВАЕ ІНТАРЭСЫ»

**Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін правялі сустрэчу на востраве Валаам у Карэліі**

(Стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

2 ЖНІЎНЯ 2025 г. СУБОТА № 147 (30535)

# МЕДЫКІ З НОВАГА ПАПАЎНЕННЯ




Фота БелТА.

**Учора больш за 10 тысяч маладых урачоў і медсясцёр прыступілі да работы**

З 1 жніўня ў бальніцы, паліклінікі, урачэбныя амбулаторыі і ФАПы па размеркаванні прыбылі каля 2450 выпускнікоў медыцынскіх універсітэтаў, якія працуюць урачамі-інтэрнамі, прыкладна 4000 спецыялістаў з сярэдняй медыцынскай адукацыяй і каля 2,2 тысячы ўрачоў, якія прайшлі інтэрнатуру. Больш за палову выпускнікоў медыцынскіх ВНУ адправіліся ў цэнтральныя раённыя бальніцы, аптэкі і іншыя арганізацыі аховы здароўя, у тым ліку ў сельскай мясцовасці. 40 % урачоў-інтэрнаў накіруюцца ў сталічныя і абласныя медыцынскія ўстановы. Трыццаць чалавек з банка адоранай моладзі размеркаваны ў рэспубліканскія навукова-практычныя цэнтры.

СТАР. 11

ЖНІВО ВЯДЗЕЦЦА АКТЫЎНЫМІ ТЭМПАМІ



4–5

СЕЗОННЫ КЛОПАТ

# РАДЫ ДАПАМАГЧЫ!

**Расказваем, як адна асобна ўзятая школа рыхтуецца да новага навучальнага года і як у гэтым удзельнічаюць вучні і іх бацькі**

Ужо зусім хутка школьнікі Беларусі сядуць за вучэбныя парты і пачнуць захапляльнае падарожжа па свеце ведаў. Школы ва ўсю рыхтуюцца да новага навучальнага года: праводзяць рамонт, закупляюць мэблю, абсталяванне, выконваюць генеральныя ўборкі. Уласны карэспандэнт «Звязды» адправілася ў гродзенскую сярэднюю школу № 41 імя А. М. Кузняцова, каб паглядзець, як там рыхтуюцца да першага верасня.



СТАР. 8-9

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X